*ARKUSZ ZAWIERA INFORMACJE PRAWNIE CHRONIONE DO MOMENTU ROZPOCZĘCIA EGZAMINU!*

**Miejsce na naklejkę**

*dysleksja* ☐

**MOB-P1_1P-082**

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

**MAJ ROK 2008**

**Czas pracy 170 minut**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 14 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

***Życzymy powodzenia!***

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie **70 punktów**

*Część I – 21 pkt*
*Część II – 49 pkt*

**Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy**

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | |

**PESEL ZDAJĄCEGO**

| | | |
|---|---|---|
| | | |

**KOD ZDAJĄCEGO**

## Część I – rozumienie czytanego tekstu

**Прачытай уважліва тэкст Барыса Сачанкі і адкажы на пытанні. Пішы коратка, згодна з патрабаваннямі.**

Барыс Сачанка

***Вяртанне дадому***
(скарочана)

1. «Усяму свой час, і час кожнай з'явы пад небам... час раскідваць камяні, і час збіраць камяні...» Так гаварыў мудрэйшы з мудрых Эклезіяст. Жыццё не раз пацвярджала […] праўдзівасць гэтых слоў. І ў нас, у Беларусі, колькі і якіх не раскідвалі камянёў! […]
2. І вось, нарэшце, – нібыта ацверажэнне: што мы робім? І выкінутае з памяці і духоўнай скарбніцы народа зноў пачынае паступова займаць сваё належнае месца, – у культуру, гісторыю, мастацтва вяртаюцца ва ўсёй сваёй першароднасці, непаўторнасці і значнасці факты, імёны, творы, без якіх Беларусь была як бы і не Беларусь. […]
3. Надышоў час паглядзець па-новаму і на дыяспару – на тых беларусаў, якія па розных прычынах апынуліся за межамі нашай краіны, жывуць там: іх жа ні многа, ні мала – некалькі мільёнаў. Доўгія гады пра іх нават не ўспаміналі – баяліся як чорт ладана[1]. А калі і згадвалі, дык толькі ў адмоўным плане. Асабліва цяжкія абвінавачанні падалі на галовы тых, хто не выракся роднай мовы, быў нераўнадушны да таго, што дзеялася на Бацькаўшчыне. […] Хвала Богу, здаецца, гэта скончылася. Сёння ёсць магчымасць паглядзець і на эміграцыю куды больш узважана, спакойна. […]
4. Вядома, беларуская эміграцыя, як, дарэчы, і ўсякая – неаднародная і па сваім паходжанні, і па палітычных, рэлігійных і іншых поглядах, ды і па становішчы ў сучасным грамадстве; да яе нельга падыходзіць апалагетычна[2]. […] Некаторым проста не было з чаго жыць, і яны змушаны былі дзесьці працаваць – акупанты ж адносіліся да тых, хто не працуе, як да сабатажнікаў[3] – садзілі ў турмы, высылалі ў Германію, а то і расстрэльвалі. Не варта забываць і яшчэ пра адно – сёй-той, спазнаўшы сталінскія лагеры і цудам вырваўшыся адтуль, не хацеў больш рызыкаваць, і калі адступалі, гнаныя Чырвонай Арміяй, немцы, адступіў разам з імі. […]
5. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, гаварыць пра эміграцыю толькі адмоўнае, як рабілася зусім нядаўна, было б несправядліва. Лепшая яе частка з гонарам вытрымала выпрабаванні лёсу, захавала любоў і прыхільнасць да сваёй Бацькаўшчыны, роднай зямлі, мовы нашай, перадала гэтую любоў сваім дзецям і ўнукам. Сёння, у сувязі з чарнобыльскай бядою, яна робіць усё магчымае, каб аблегчыць пакуты нашых людзей, дапамагчы нам.
6. Створаны ў эміграцыі і пэўныя духоўныя каштоўнасці. Не браць іх пад увагу было б проста неразумна. Задача – вярнуць гэтыя каштоўнасці на Радзіму, пазнаёміць з імі тых беларусаў, якія пра іх мала ці зусім нічога не ведаюць. Гэта не лёгка, бо сёй-той з творцаў гэтых каштоўнасцей не такі, якім яго хацелася б бачыць. Але не

[1] ладан – пахучая смала некаторых трапічных дрэў (выкарыстоўваецца для курэння ў час рэлігійных абрадаў)
[2] апалагетычна (ад апалагет) – абараняючы, пахвальна
[3] сабатажнік – той, хто займаецца сабатажам

будзем забываць на тыя ўмовы, у якіх гэтыя творцы змушаны былі жыць. Народная мудрасць кажа: ходзячы ля вады – замочышся, а завіхаючыся ля мукі – запылішся... Не ўбярогся ад гэтага і сёй-той з вядомых у эміграцыі творцаў... Не, ніхто не збіраецца іх апраўдваць! Кесару – кесарава! Але ж і спрашчаць, а то свядома ці несвядома скажаць факты з біяграфіі, як гэта іншы раз у нас робіцца, прыпісваць тое, чаго не было – таксама няма патрэбы.

**7.** Ды і помніць трэба, не забываць: некаторыя з гэтых людзей не жылі пры савецкай уладзе, савецкага ладу жыцця яны не ведалі, не бачылі на свае вочы, меркавалі пра яго па тых звестках, што даходзілі са сродкаў масавай інфармацыі. А звесткі тыя не заўсёды, як вядома, былі праўдзівыя. Ды і тое, што рабілася ў нашай краіне ў трыццатыя–саракавыя гады, не выклікала прыхільнасці ў каго б там ні было. А яны ж, нашы землякі-суайчыннікі, былі сынамі і дочкамі свайго народа, любілі сваю Бацькаўшчыну, лёс яе быў ім неабыякавы. І рэакцыя на высылкі, арышты і расстрэлы ні ў чым не вінаватых была адпаведная...

**8.** Калі пачалася вайна і немцы акупіравалі Беларусь, аўтарытэт гэтых вядомых і за мяжою, і ў нас, у рэспубліцы, людзей вельмі ж патрэбны быў розным […] калабарантам. І яны выкарыстоўвалі іх аўтарытэт у сваіх мэтах. І паўстаць супраць не заўсёды выпадала, ды і не ў кожнага хапала адвагі – такое магло каштаваць жыццё. (Пра гэта добра расказваюць у сваіх успамінах М. Забэйда-Суміцкі і Л. Геніюш.) Так, гэта нікому з іх не робіць гонару. Што ж, за хістанні, нерашучасць і ўсё іншае яны панеслі пакаранне – іх імёны гадамі не згадваліся ў нашым друку, а самі яны змушаны былі жыць далёка ад сваёй Радзімы. Ды некаторыя жывуць і цяпер там. А якое жыццё без Радзімы, без надзеі нават убачыць яе, як душыць «зямлі чужой ярмо», прызналася ў адным з вершаў найлепшая паэтка беларускай эміграцыі Наталля Арсеннева. […]

**9.** «Смачная і даўкая костка» – «Бацькаўшчына і Радзіма» – не дае нікому спакойна жыць на чужыне. Успаміны маленства трывожаць, мучаць гадамі. Адсюль і хвароба – страшная, невылечная – настальгія. З размоў з эмігрантамі, з пісьмаў і творчасці вядома, што самае вялікае, запаветнае жаданне кожнага з іх – вярнуцца дадому, зноў быць там, дзе нарадзіўся, жыў. Аднак вярнуцца дадому, на Бацькаўшчыну, не кожнаму ўдаецца. У гэтым некаторую перавагу над усімі астатнімі маюць хіба творцы – яны вяртаюцца дадому калі не самі, дык сваімі творамі... «Туга па Радзіме» – гэта спроба вярнуць на Бацькаўшчыну тое, што ёй па праву належыць. Будзем спадзявацца, што ўслед за першай ластаўкай прыляціць, вернецца з доўгага выраю і ўсё, што таго заслугоўвае.

*Б. Сачанка, Вяртанне дадому, [у:] Яго ж, Туга па Радзіме, Мінск 1992, с. 5–8.*

## Заданні да тэксту

### Заданне 1 *(1 пункт)*

**На аснове 2 абзаца напішы, што, паводле аўтара, з'яўляецца прычынай таго, што «Беларусь была як бы і не Беларусь».**

Паводле аўтара, прычынай таго з'яўляецца тое, што праз доўгі час з памяці народа былі выкінутыя нейкія важныя факты, імёны, творы, якія былі звязаныя з эмігрантамі.

### Заданне 2 *(1 пункт)*

**Закончы выказванне, карыстаючыся 3 абзацам.**

**Пра беларускую эміграцыю**

**а)** заўсёды пісалі з вялікай ахвотай, але толькі ў адмоўным плане.

**б)** згадвалі рэдка, але тады толькі ў станоўчым плане.

**в)** праз доўгі час зусім нічога не пісалі, а калі і згадвалі, тады заўсёды ў адмоўным плане.

### Заданне 3 *(1 пункт)*

**Карыстаючыся 4 абзацам, выберы правільны адказ на пытанне, якая эміграцыя з'яўляецца неаднароднай?**

**а)** Толькі беларуская.

**б)** Кожная.

**в)** Беларуская і польская.

### Заданне 4 *(1 пункт)*

**На аснове 6 абзаца напішы, чаму Барыс Сачанка лічыць, што творчасць беларускіх эміграцыйных творцаў павінна вярнуцца на Радзіму.**

Творчасць эмігрантаў павінна вярнуцца на Радзіму, таму што гэта каштоўнасць, з якой трэба пазнаёміць тых беларусаў, якія пра яе яшчэ нічога не ведаюць.

### Заданне 5 *(2 пункты)*

**Растлумач, як разумееш словы прыказкі, якія прыводзіць аўтар у 6 абзацы: «Ходзячы ля вады – замочышся, а завіхаючыся ля мукі – запылішся...».**

Кожнае асяроддзе мае на нас свой уплыў. Мы да яго прыпадабняемся. Яно накідае нам пэўныя нормы – станоўчага характру, але таксама і адмоўнага. Аднак мы самі адказваем за свае паводзіны.

### Заданне 6 *(2 пункты)*

**На аснове 8 абзаца напішы, якое пакаранне панеслі эмігранты за сваю нерашучасць у часе вайны.**

За сваю нерашучасць у час вайны эмігранты панеслі цяжкае пакаранне. Іх імёны гадамі не згадваліся ў беларускім друку, а самі яны змушаны былі жыць далёка ад радзімы.

## Заданне 7 *(2 пункты)*

**На аснове 9 абзаца напішы, чаму Барыс Сачанка назваў настальгію страшнай, невылечнай хваробай?**

Настальгія – гэта страшная, невылечная хвароба, таму што ўвесь час успаміны мучаць эмігрантаў, яны не могуць забыць пра айчыну і кожны з іх хоча вярнуцца дадому. Аднак не ўсім гэта даводзіцца.

## Заданне 8 *(3 пункты)*

**Карыстаючыся 3, 4, 5, 6 і 8 абзацамі, напішы, чым характарызуецца, паводле аўтара, беларуская эміграцыя (падай чатыры прыклады).**

- яна неаднародная па сваім паходжанні, па палітычных і рэлігйных поглядах;
- большая частка эмігрантаў з гонарам вытрымала свой лёс, захавала любоў да радзімы і перадала яе дзецям;
- эмігранты аказваюць дапамогу сваім суродзічам;
- эмігранты з’яўляюцца творцамі духоўных каштоўнасцей;

## Заданне 9 *(1 пункт)*

**На аснове 9 абзаца напішы, чаму, паводле Барыса Сачанкі, творцы маюць перавагу ў здзяйсненні найбольшай мары эмігрантаў.**

Творцы маюць перавагу ў здзяйсненні найбольшай мары эмігрантаў, таму што яны могуць вяртацца на радзіму прынамсі ў сваіх творах.

## Заданне 10 *(3 пункты)*

**Выясні значэнне фразеалагізмаў у суаднясенні з тэкстам на аснове:**

3 абзаца – **а)** баяцца як чорт ладана – вельмі моцна баяцца

6 абзаца – **б)** кесару – кесарава – кожнаму належыцца тое, на што ён заслужыў

9 абзаца – **в)** вярнуцца з выраю – вярнуцца з чужыны на радзіму

## Заданне 11 *(2 пункты)*

**Знайдзі словы да дадзеных значэнняў:**

у 3 абзацы – а) людзі, якія жывуць па-за межамі сваёй краіны – эміграцыя

у 6 абзацы – б) апісанне чыйго-небудзь жыцця – біяграфія

у 8 абзацы – в) агульнапрызнаны ўплыў, заслужанае давер’е, якімі карыстаецца якая-небудзь асоба ў грамадскім жыцці – аўтарытэт

у 9 абзацы – г) туга па радзіме, маркота па бацькаўшчыне – настальгія

## Заданне 12 *(2 пункты)*

**Назаві дзве тэмы, якія закранае Барыс Сачанка ў сваім тэксце:**

1) у 2 і 6 абзацах

Вяртанне ў беларускую літаратуру выклятых творцаў-эмігрантаў і іх творчасці

2) у 9 абзацы

Туга па радзіме

## Część II – pisanie własnego tekstu w związku z tekstem literackim zamieszczonym w arkuszu.

**Arkusz zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu związanego z tekstem literackim dołączonym do tematu. Wybierz jeden z tematów i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl.**

**Тэма 1:**

**На аснове аналізу і інтэрпрэтацыі вершаў Алеся Барскага *Я сын зямлі беластоцкай...* і Віктара Шведа *Бацькоўскі парог* апішы, чым для паэтаў з’яўляецца Малая Айчына.**

Алесь Барскі

* * *

Я сын зямлі беластоцкай,
і іншай мне маці не трэба,
там сосны высока-высокія
ад зямлі да блакітнага неба.
Там рэчкі сінія-сінія
і ветры з далонямі кволымі[4]
бягуць па зялёнай краіне,
як сябры заўсёды вясёлыя.
Там сонца прыходзіць у дрэвы,
і дрэвы да сонца імкнуцца,
і вабіць краіна нас спевам,
і просіць і просіць вярнуцца.

*А. Барскі, Я сын зямлі беластоцкай, [у:] В. Сянкевіч, Са словам праз стагоддзі. Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа сярэдніх школ, WSiP, Warszawa 2002, s. 20.*

[4] кволы – слабы, хілы; нетрывалы

Віктар Швед, ***Бацькоўскі парог***

Куды б мяне лёс не кінуў,
З далёкіх і з блізкіх дарог
Заўсёды знайду пуцявіну
На родны бацькоўскі парог.

Раўніны, пагоркі крутыя
Змяняюць свой від на вачах.
Ля тракту слупы вартавыя
Трымаюць драты на плячах.

Пабег па дратах, як па жылах,
Пад стрэхі вясковыя ток.
Дзе цьмяна капцілка[5] свяціла,
Святло залунала здалёк.
Чуваць гул матораў на нівах,
І песні чуваць мілы тон
Людзей працавітых руплівых,
Што выйшлі збіраць свежы плён.

О, колькі ў вас прыгажосці,
Палі з ураджаем, лугі,
Мясціны маёй маладосці,
Бацькоўскі парог дарагі.

*В. Швед, Бацькоўскі парог, [у:] В. Сянкевіч, Са словам праз стагоддзі. Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа сярэдніх школ, WSiP,Warszawa 2002, s. 6.*

**Тэма 2:**

**На аснове інтэрпрэтацыі дадзеных фрагментаў твора Васіля Быкава *На чорных лядах* апішы складанасць людскіх выбараў у часе вайны.**

Васіль Быкаў, ***На чорных лядах***[6]

(фрагменты)

[…] Добра яшчэ, калі ўсіх пераб'юць. А калі каго возьмуць параненым, непрытомным, павязуць у горад ды пачнуць вызнаваць, чый, каму якая радня, хто бацькі, жанкі, дзеці? Тады што? Не, яны даўно ўжо ведалі, што пагібель – не найгоршае з усяго, што нарыхтаваў ім іх паўстанцкі лёс. Горш, калі яны, гінучы, пацягнуць на пакуты іншых, тых, дзеля каго па сутнасці распачалі ўсё тое. Нават забітымі яны не знойдуць паратунку ад бальшавікоў.

Таму яны наважыліся. Доўга не абмяркоўвалі, камандзір сказаў, і ўсе пагадзіліся, выйсця ў іх не было. Зброю – вінтоўкі і наган – пакінуць з сабой, а паперы, якія дакументы раніцай сабралі да купы і спалілі ў ядлоўцы. І засталіся без імёнаў і прозвішчаў, без роду-племя – восем абадраных, згаладнелых, аброслых барадамі валацуг, што вырашылі сёння канчаць...

[5] капцілка – самаробнае асвятляльнае прыстасаванне на газе; лямпа без шкла
[6] ляда – дзялянка высечанага лесу са спаленым ці яшчэ непрыбраным суччам

Рабіць тое трэба было як найхутчэй, пакуль тыя з начы, здаецца, згубілі іх след у гэтым лесе, і яны адарваліся ад даганятых, неяк заблыталі на балацявіне сляды і выйшлі ў ціхі лесавы край. Брысці[7] далей было зусім рызыкоўна. […]

Камандзір, крокі на тры адступіўшы ад ямы, як заўжды, з засяроджана стрыманым выглядам думаў сваю неадчэпную думу пра гэтых людзей. Цяпер ім патрэбна была якая гадзіна спакою, каб не пашкодзілі тыя. Праўда, пакуль было ціха, але ён не меў ніякай гарантыі, што цішыня задоўжыцца і дасць ім магчымасць зрабіць задуманае.

Вядома, усё тое было жахліва, не па-чалавечы і не па-боску, напэўна, але што ж ім было рабіць? Увесь гэты жах утварыўся не па іхняй волі – д'ябал ці лёс падвялі іх менавіта да такога выніку.

Каб толькі давесці ўсё да канца, а там... А там хай жыве Беларусь! Без іх. […]

Як заўжды на вайне, галоўная плата – кроў, і плаціць той, хто найменш вінаваты. Як яны тут – былы камандзір роты ды гэтыя дзядзькі-шарагоўцы. А яшчэ хлопчык... камандзір колькі ні думаў, ніяк не мог пагадзіцца з пагібеллю Валодзькі. І не ведаў, што можна прыдумаць, як схітрыць, каб неяк зберагчы ягонае жыццё. Аднаго з усіх. Якія цвёрда рашылі, калі тое – дык усім разам. Без выключэння. Бо выключэнне знайшлося б не для аднаго. А ім трэба было не пакінуць слядоў. Яно, мусіць і правільна і маральна. Ды во гэты падлетак, ён блытаў усе іх лагічныя меркаванні і пратэставаў супраць пагібелі. […]

Думкі, аднак, самі лезлі ў галаву і самыя неадчэпныя з іх былі пра сябе. Не хацелася паміраць Валодзьку Сулашчыку, хацелася жыць. Як не выпала жыць ягонаму бацьку, шмат каму з шарагоўцаў ды камандзіраў іхняй Слуцкай брыгады. Некаторыя, можа, і ўберагуцца, думаў Валодзька, асабліва па той бок польскай мяжы, але не ўсе. Валодзька ўжо чуў, што камандзіраў ды кіраўнікоў паўстання палякі выдалі бальшавікам, некаторых парасстралялі ў Слуцку, іншых сем'ямі вывезлі немаведама куды на ўсход. […] Было дужа трывожна і клопатна і за сябе, і за іншых – родных і блізкіх, якім ён нічым памагчы не мог. Хіба апроч свае смерці. […]

Ён угаворваў сябе: хутка ўжо скончыцца, усё супакоіцца назаўсёды. Але спакою ад таго не прыбаўлялася, рабілася ўсё нясцерпней. Хоць у думках ён і казаў сабе: ну чаго шкадаваць? Жыцця? Дык якое гэта жыццё? Гэта пекла, боскае пакаранне, а не жыццё. […]

Цярпліва чакаючы, калі нарэшце будзе гатова гэта яма-магіла, камандзір міжволі і ў каторы раз перабіраў у памяці падзеі апошніх тыдняў-месяцаў іх барацьбы, каб усё ж хоць перад канцом зразумець нейкі таямнічы сэнс іхняга трагічнага фіналу. […]

Нарэшце адчуўшы, што хопіць, Забела з большага параўняў дол у яме, памераў крокамі. Атрымалася восем крокаў удоўжкі, мабыць, хопіць на ўсіх.

– Фініта ля камедыя[8]! – знарок бадзёрым голасам гукнуў ён і кінуў угору рыдлёўку.

– Ладна, годзе[9], – глуха азваўся камандзір і паклікаў астатніх. – Усе, – сюды!

Калі яны неяк нясмела, бы баючыся, узлязалі на жвір, бліжай да ямы, камандзір ціха спытаўся:

– Хто першы?

– Першы ўжо ёсць, – сказаў Мяцельскі. – Во Аўстрыяка.

– Давай яго сюды, – загадаў камандзір.

Разварочваючы ботамі рыхлую кучу, Мяцельскі рашуча падвалок распластанае цела Аўстрыякі да ямы, уніз галавой падаў яго Забелу.

---

[7] брысці – марудна, з цяжкасцю ісці
[8] фініта ля камедыя (лац. камедыя скончаная) – канец, хопіць
[9] годзе – хопіць, досыць, даволі

Тым часам да ямы падышлі Дзед з Кажухарам; трошкі зводдаль боязна-ваўкавата прыткнуўся непрыкметны Казак. Валодзька ўвесь час быў побач з камандзірам. Ён змарнеў з твару, прыціх, здаецца, баяўся вымавіць слова. Мяцельскі высока стаяў на кучы жвіру.

– Дык як будзем? Па адным ці ўсе разам?

– Па адным, – ціха мовіў камандзір. – З нагана.

– У яме?

– У яме. Каб меней грукату.

Мабыць, усе ўсё зразумелі і сціхлі, нават не дыхалі. Камандзір абвёў усіх чужым напружаным позіркам і адчуў, што трэба нешта сказаць на развітанне. Ці на суцяшэнне. Калі ў іхнім становішчы яшчэ існавала якое суцяшэнне. І ён сказаў:

– Што ж, спадары... Нам не ўдалося, можа, удасца іншым. Яны нас успомняць. Усё ж мы не за сябе, не за сваё, якога ў нас не было. Мы – за Беларусь. Нашу няшчасную старонку. Прымі, Божа, твае ахвяры... […]

На край ямы ступіў амаль змярцвелы Валодзька.

– Сулашчык! – гукнуў да яго камандзір. – Пастой...

Валодзька спыніўся, ледзьве ўтрымаўшыся на беражку ямы. Ён нават не зірнуў туды, штосьці новае адчуўшы ў голасе камандзіра.

– Табе, Сулашчык, заданне: закапаць, зараўняць. Каб следу не асталася. І – жыві!

– Я!

– Ты, а хто ж. Жыві. За нас. За бацьку. Дай я цябе абдыму.

Няспрытна, адною рукой камандзір нямоцна абняў Валодзьку. Трохі памарудзіў і, таксама густа абрушваючы жвір з берагоў, зваліўся ў яму. Валодзька застаўся стаяць – ашаломлены, разгублены, працяты адным пытаннем: як гэта – жыві? Адзін? За ўсіх? Але як яму жыць без іх? Ці магчыма гэта наогул? Тое было незразумела, і ён стаяў, агалошаны, аднак, раптоўнай надзеяй, што будзе жыць. Яна, тая надзея, заглушыла ўсе ранейшыя памкненні, разбудзіла новыя пачуцці. У душу лінула святло, і ён ажно скалануўся ад неспадзеўкі, калі з ямы пачуўся апошні стрэл. Гэта быў стрэл камандзіра. Валодзька заставаўся жыць.

Пасля ён закопваў яму-магілу і плакаў. Ужо можна было не стрымліваць слёз, саромецца тут не было каго. У яму ён не зірнуў ні разу, ён гроб і гроб рыдлёўкаю рыхлы жвір з берагоў. […]

Капаў Валодзька нядоўга, з усяе сілы гроб і гроб жвір, раскідваў яго ўбакі, каб меней было прыкметна, што тут нехта поркаўся. Стаміўся страшэнна, але спакваля[10] пачаў спакайнець. Перад тым усё баяўся не справіцца, не паспець скончыць сваю сумную справу. Усё азіраючыся, баючыся, што між хвой паявяцца тыя. Але, здаецца, паспеў. Уся зброя – наган і вінтоўкі – засталася ў яме, у яго была толькі рыдлёўка, якую трэба было закінуць куды далей. Каб не знайшлі.

Мабыць, ужо падвячоркам з рыдлёўкай у руцэ ён і пабрыў па лесе. За ім, пералятаючы з дрэва на дрэва, сакатала і сакатала, бы гналася, зграя сарок, і ён не ведаў, як ад іх адкараскацца[11].

Ён ішоў і ішоў, сам не ведаючы, куды, – абы прэч з гэтых жудасных чорных лядаў...

1994 г.

*В. Быкаў, На чорных лядах, [у:] В. Сянкевіч, Я. Грыгарук, Беларуская літаратура. Хрэстаматыя для сярэдніх школ, WSiP, Warszawa 2001, s. 240-253.*

[10] спакваля – паступова, марудна, павольна
[11] адкараскацца – адчапіцца, адвязацца ад каго-небудзь або чаго-небудзь

# CZYSTOPIS

**Тэма 1:**

У двух вершах прадстаўлена праблема, чым для паэтаў з’яўляецца Малая Айчына. Малой Айчынай можа быць рэгіён, у якім чалавек жыве. Гэта ёсць тое, што спалучае людзей. Яны адчуваюць сувязь паміж сабою і гэтым куском зямлі, на якім правялі дзяцінства.

Першы верш напісаў славуты паэт беластоцкай зямлі – Алесь Барскі. Яго сапраўднае прозвішча – Аляксандр Баршчэўскі. Ён нарадзіўся ў 1930 г. у вёсцы Бандары. Паэт, публіцыст, перакладчык. Выдаў многія паэтычныя зборнікі, м.інш. «Белавежскія матывы».

У сваім вершы Алесь Барскі прадстаўляе сябе як сына зямлі беластоцкай. Ён кажа, што «іншай мне маці не трэба», таму што ён мае ўжо адну і каханую.
У наступных строфах паэт апісвае краіну, у якой ён жыве. Піша пра высокія сосны і сінія рэчкі. У вершы ёсць многа эпітэтаў, метафараў, апісанняў прыроды. Выступае таксама персаніфікацыя: зямля беластоцкая, як маці нашага аўтара. Сваім вершам Алесь Барскі паказвае, чым ёсць для яго Беласточчына і за чым ён тужыць. Апісвае з’явы прыроды, якія здаюцца яму незвычайна прыгожымі.

Другім жыхарам, які кахае сваю бацькаўшчыну, з’яўляецца Віктар Швед – таксама выдатны паэт. У сваім вершы «Бацькоўскі парог» паэт апісвае месца, у якім правёў сваё дзяцінства і юнацтва. Ён кажа, што заўсёды знойдзе пуцявіну да свайго дома. Аўтар апісвае выгляд вёскі і працу людзей на нівах. Ён вельмі тужыць за сваёй роднай мясцінай і за людзьмі, якія там асталіся. У гэтым вершы ёсць таксама многа эпітэтаў, метафар, сімволікі і персаніфікацыі. У сваім творы Віктар Швед прадстаўляе тое, як ён запамятаў сваю мясціну і яе жыхароў. Паэт вяртаецца марамі да свайго дзяцінства.

Кожнаму паэту яго месца дзяцінства з’яўляецца Малой Айчынай, больш важнай, калі ён знаходзіцца далёка ад бацькаўшчыны. Часта ён вяртаецца марамі да сваіх сяброў і забаў. Сваю тугу ён пералівае на белыя карткі. Толькі ў такі спосаб ён можа цераз хвіліну пачуцца як на Радзіме.

**Тэма 2:**

Васіль Быкаў – адзін з самых выдатных беларускіх пісьменнікаў. Аб гэтым сведчыць факт, што яму давялося быць кандыдатам у Нобелеўскую прэмію. Вельмі важным для беларусаў з'яўляецца яго аповесць «На чорных лядах», у якой аўтар апісве складанасць людскіх выбараў у час вайны з бальшавікамі.

Героямі гэтага твора з'яўляюцца паўстанцы. Іх восем: Мяцельскі, Валодзька, Аўстрыяка, Дзед, Кажухар, Казак, Забела і камандзір. Яны ўсе ведаюць, што ў час гэтай вайны лепш загінуць, чым трапіць у бальшавіцкую няволю. Лепш памерці, чым здрадзіць сваім блізкім і таварышам. Такім чынам, паўстанцы, якія апынуліся ў бязвыхадным становішчы, вырашылі закончыць жыццё смагубствам. Жахліва было паміраць, але яны, як сапраўдныя патрыёты, задумалі прысвяціць сваё жыццё айчыне – свабоднай Беларусі. Яны былі найменш вінаватымі, але на вайне заўсёды такія найбольш пакутуюць. Адзін Валодзька пратэставаў супраць смерці. Яму хацелася жыць. Ён ведаў, што вайна забірае многіх людзей, блізкіх, але меў надзею, што ўдасца перажыць. Было вельмі неспакойна, ніхто не ведаў, калі памрэ. Усе шкадавалі жыцця, але непатрэбна, бо гэта было пекла жывых людзей. Паўстанцы былі смелымі, адважнымі і псіхічна моцнымі людзьмі. Яны не плакалі над сваім лёсам. Прымалі яго з павагай і гонарам, хаця ўсе, напэўна, баяліся смерці. Калі прыйшла пара, яны адзін за адным падалі ў яму. Ім не ўдалося адолець ворага – бальшавікоў, не ўдалося нават астацца жывымі. Да апошняй хвіліны ў іх была надзея на тое, што нехта перажыве, хто раскажа народу пра іхнюю ахвяру. Астаўся толькі Валодзька, якому прыйшлося закапаць таварышаў у яме. Ён быў жывы, хаця спадзяваўся найгоршага. Яго душа напоўнілася нейкай свежай сілай. Хлопец закопваў паўстанцаў, баючыся, каб ніхто яго не ўбачыў. Затым хутка пайшоў, не ведаючы куды, каб шукаць свайго лепшага жыцця. І толькі зграя сарок не давала яму спакою. Іх крык напамінаў аб гэтай страшнай падзеі, аб трагічнай смерці паўстанцаў.

Лёс чалавека ў час вайны з бальшавікамі, як і кожнай іншай, быў вельмі цяжкі. Людзі не маглі нармальна, свабодна жыць. Яны не ведалі, калі прыйдзе смерць і таму ўвесь час баяліся. Часта станавіліся адзінокімі, вайна забірала іх сяброў і сям'ю. Нярэдка іх вывозілі ў глыб Расіі, на ўсход, дзе жыць было амаль немагчыма. Ваяваць было таксама нялёгка, вораг быў значна мацнейшы. Таму здаралася, што выбіралі смерць. Цяжкі быў гэта выбар і адначасова трагічны, але не было іншага выхаду. Вельмі праўдзіва адлюстраваў гэта ўсё Васіль Быкаў у сваім творы «На чорных лядах».